# З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ, СЯБРЫ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

**Беларускі УНІВЕРСІТЭТ**

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 24 (1060) ● Панядзелак, 2 верасня 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

# У ДОБРЫ ШЛЯХ!

**У. М. СІКОРСКІ, рэктар БДУ**

Пачатак навучальнага года — адначасова і працоўны, і святочны дзень для ўсіх нас — выкладчыкаў і студэнтаў. Ён — яркая падзея і для нашага амаль трохтысячнага папаўнення. для цябе, першакурснік. Дзень гэты з'яўляецца як бы прадвеснікам вялікага паходу за ведамі, напружанай працы, творчых поспехаў і хваляванняў, прыемных турбот і клопатаў.

Кожны новы навучальны год прыносіць з сабой і новыя, павышаныя патрабаванні да вышэйшай школы Гэта тлумачыцца імклівым развіццём навукі, тэхнікі і культуры, складанасцю задач, якія вырашае Савецкая дзяржава. У сёлетнім навучальным годзе універсітэт пераходзіць на новыя вучэбныя планы, якія будуць садзейнічаць далейшаму ўдасканаленню падрыхтоўкі кадраў. У сувязі з гэтым прадугледжваецца ўвядзенне новых спецыялізацый. На фізічным факультэце, напрыклад, пачнецца падрыхтоўка спецыялістаў па аптычных прыборах, на біялагічным — па малекулярнай біялогіі, філалагічны факультэт пачне рыхтаваць спецыялістаў у галіне славянскіх моў. Будзе ўдасканальвацца спецыялізацыя студэнтаў на хімічным, матэматычным, гістарычным факультэтах, факультэтах журналістыкі і прыкладной матэматыкі.

Зразумела, новы змест навучання патрабуе не толькі крытычнай пераацэнкі метадаў выкладання, паляпшэння ўсёй вучэбна-выхаваўчай работы. Задача заключаецца ў тым, каб кожны студэнт больш рацыянальна выкарыстоўваў спосабы і прыёмы авалодвання ведамі, паўсядзённа паглыбляў і расшыраў свой кругагляд, настойліва штурмаваў вяршыні сучаснай навукі.

Першакурснік — учарашні школьнік, і спачатку ён непазбежна сутыкнецца з пэўнымі цяжкасцямі, паколькі працэс навучання ва універсітэце істотна адрозніваецца ад вучобы ў сярэдняй школе. Ад студэнта патрабуецца перш за ўсё уменне самастойна вучыцца. А гэта няпроста, не ўсе аказваюцца здольнымі хутка прыстасавацца да новых абставін. Хаця экзаменатары на ўступных экзаменах і імкнуцца адабраць найбольш дастойных, некаторыя юнакі і дзяўчаты на першым этапе не спраўляюцца з праграмай. Выяўляюцца прагалы ў ведах, няўменне сістэматычна, планамерна і паўсядзённа арганізаваць сваю працу.

Выходзіць, стаць пераможцай конкурсных экзаменаў, лепшым сярод лепшых — гэта толькі старт. Наперадзе доўгая дыстанцыя да вяршынь ведаў — цэлых дзесяць семестраў, якую пераадольваюць толькі працавітыя, моцныя духам, дапытлівыя. Хто не ўсведамляе гэтага, таго чакае расчараванне.

Вучоба ў ВНУ—гэта мерная хада наперад, рух ад ніжэйшага да вышэйшага, гэта цікавае жыццё, поўнае нечаканасцей, штодзённых адкрыццяў, багатае дзівосным пранікненнем у цудоўны свет навукі. На працягу пяці гадоў будзе здзяйсняцца шматгранны, дынамічны працэс станаўлення кожнага з вас як будучага спецыяліста.

А што сабой уяўляе работнік з вышэйшай адукацыяй? Як адзначыў Л. І. Брэжнеў у прамове на Усесаюзным злёце студэнтаў у Маскве, сучасны савецкі спецыяліст — чалавек, які не толькі мае шырокую навуковую і практычную падрыхтоўку, дасканала валодае сваёй прафесіяй, але і добра ведае асновы марксісцка-ленінскага вучэння, ясна бачыць палітычныя мэты партыі і дзяржавы, здольны змагацца за іх ажыццяўленне.

Дзякуючы клопатам Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада Беларускі дзяржаўны універсітэт мае ўсё неабходнае для падрыхтоўкі такіх кадраў: вучэбныя карпусы, інтэрнаты, спартыўны комплекс, фундаментальную бібліятэку. Вучэбныя кабінеты і лабараторыі аснашчаны першакласным абсталяваннем і дакладнейшымі прыборамі, якія дазваляюць весці даследаванні на ўзроўні сучаснага развіцця навукі і тэхнікі.

У нас створаны ўсе ўмовы для навуковай творчасці, шырокіх даследаванняў у галіне фізікі, матэматыкі, біялогіі, грамадскіх і іншых навук. Многія навуковыя даследаванні, якія праводзяць кафедры і лабараторыі, іх адкрыцці і распрацоўкі знаходзяць практычнае выкарыстанне ў народнай гаспадарцы.

Новы навучальны год бярэ старт у той час, калі савецкі народа паспяхова ажыццяўляе задачы чацвёртага, вызначальнага года дзевятай пяцігодкі, настойліва здзяйсняе гістарычныя прадвызначэнні XXIV з'езда КПСС. І таму абавязак кожнага першакурсніка, як і ўсіх студэнтаў універсітэта, выдатна вучыцца, глыбока пазнаваць «сакрэты» прафесійнага майстэрства, з годнасцю несці і працягваць слаўныя традыцыі флагмана вышэйшай адукацыі ў нашай рэспубліцы.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта ўпэўнены, што ўсе першакурснікі прыкладуць максімум працавітасці, старання, маладога запалу, каб стаць дастойнай зменай, здольнай рашаць задачы камуністычнага будаўніцтва.

У добры шлях, вялікіх вам поспехаў, сябры!



НОВАЕ папаўненне... Хто яны, што так настойліва аспрэчвалі права стаць студэнтамі універсітэта? Пасля ўступных экзаменаў мы пабывалі ў дэкана хімічнага

# ЯК ГЭТА БЫЛО

факультэта Генадзя Аляксеевіча Браніцкага ў час, калі ён гутарыў з абітурыентамі.



Сярод прэтэндэнтаў на студэнцкія месцы — большасць дзяўчаты, самыя адданыя паклонніцы хіміі. Менавіта хімфак яны выбралі невыпадкова, ужо два-тры гады назад цвёрда вырашылі пытанне аб сваім прызванні і працавалі з вялікай энергіяй і адказнасцю. Адзін з паказчыкаў гэтага—шматлікія граматы, атрыманыя на розных алімпіядах. У Святланы Аблажэй, выпускніцы Ахонаўскай школы Дзятлаўскага раёна, напрыклад, граматамі адзначаны поспехі не толькі ў вывучэнні хіміі, але таксама фізікі і матэматыкі. У школе дзяўчына вяла вялікую грамадскую работу, узначальвала камсамольскую арганізацыю.

Сяргей Пытлеў у школе № 3 г. Вілейкі быў сярод лепшых вучняў. Актыўны ўдзельнік хімічнага, фізічнага, матэматычнага гурткоў, ён не аднойчы дабіваўся поспеху ў алімпіядах. Адзначана перамогамі і яго спартыўная біяграфія.

Шматлікія граматы Людмілы Гусачэнка дапаўняе накіраванне Сібірскага аддзялення АН СССР на вучобу ў ВНУ хімічнага профілю.

Выдатна здала ўсе экзамены Людміла Касач. Не разгубілася, атрымаўшы чацвёрку па хіміі, медалістка Ліда Маслоўская з Ляхавіч. Яна з гонарам вытрымала далейшыя экзаменацыйныя выпрабаванні і стала студэнткай.

Адказваючы на пытанні дэкана, юнакі і дзяўчаты адкрываюцца больш шырока, расказваюць пра свае схільнасці і захапленні. Яны не толькі ўчарашнія школьнікі, але і спартсмены, мастакі, танцоры...

— Не забывайце пра гэтыя свае таленты ў час студэнцтва, — дае наказ Генадзь Аляксеевіч Браніцкі.

***

А на гістфаку ў гэты дзень нас прыемна здзівіла, што сярод прыйшоўшых на субяседаванне даволі многа юнакоў.

Дэкан гістфака Іраіда Осіпаўна Царук ахарактарызавала кантынгент абітурыентаў гістфака, адзначыла добрую падрыхтоўку выпускнікоў сярэдніх школ: Лысіцкай Нясвіжскага раёна (адтуль паступілі дзве медалісткі — Ларыса Жырко і Людміла Кохан), Заастравецкай Клецкага раёна, Старадарожскай № 2, Першамайскай Лідскага раёна, Слуцкіх №№ 1, 2, Мазырскіх №№ 8, 10, Мінскіх №№ 19, 87 і іншых.

Выдатнымі адказамі ў час экзамена па гісторыі парадавалі выкладчыкаў Г. Сморшчак, А. Іваноў, А. Парахня, Ю. Іваноў, Л. Вараб'ёва, М. Копаць, В. Лукашык, М. Давыдаў і іншыя.

Да стала, за якім вядзецца гутарка з абітурыентамі вячэрняга аддзялення, падыходзяць людзі больш саліднага ўзросту: Аляксандр Ахраменка, слесар-зборшчык гадзіннікавага завода, мае дзевяць гадоў працоўнага стажу, Вольга Мых, кантралёр АТК завода «Транзістар», чатыры гады працуе на вытворчасці; у Мікалая Ростуна, слесара завода зборнага жалезабетону, стаж восем гадоў; амаль столькі мае Уладзімір Сафонаў. Кожны з названых паступаў сёлета не першы раз — і чацвёрты, і пяты. Раней атрымлівалі пяцёркі па гісторыі, але падводзілі іншыя дысцыпліны У гэтым

[Працяг на 2-й стар.].

# ТРЭЦІ СЕМЕСТР ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Амаль двухтысячны студэнцкі будаўнічы атрад універсітэта вярнуўся са сваіх месц дыслакацыі. Узведзены сотні жылых дамоў, новыя школы, жывёлагадоўчыя і вытворчыя памяшканні. Аказана дапамога калгасам і саўгасам у нарыхтоўцы кармоў і ўборцы ўраджаю вызначальнага года пяцігодкі.

Але трэці працоўны семестр не закончыўся. Ён працягнецца і ў верасні.

Студэнты II, III і IV курсаў выязджаюць у калгасы і саўгасы рэспублікі на ўборку бульбы і іншых сельскагаспадарчых культур. Ураджай у гэтым годзе выдаўся добры. Тым больш і працаваць трэба па-ўдарнаму.

Камітэт камсамола універсітэта звяртаецца да камсоргаў, камсамольскага актыву і да ўсіх камсамольцаў з заклікам разгарнуць шырокае сацыялістычнае спаборніцтва на сельскагаспадарчых работах паміж групамі, курсамі і факультэтамі. «Кожны дзень — ударны!» — дэвіз спаборніцтва.

У самы кароткі тэрмін трэба ўстанавіць сувязі з мясцовымі грамадскімі арганізацыямі, стварыць агітбрыгады з ліку аматараў мастацкай самадзейнасці, укамплектаваць лектарскія групы.

Агітацыйна - прапагандысцкая работа студэнта, яго актыўнасць будуць улічвацца пры падвядзенні вынікаў грамадска-палітычнай практыкі, прыёме Ленінскага заліку.

Камсамольцы і моладзь універсітэта, нашай дапамогі чакае вёска!

**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.**



**НА ЗДЫМКАХ:**

**● Афармленне дакументаў — справа сур'ёзная. Дапамагае абітурыентам зрабіць усё па правілах намеснік адказнага сакратара прыёмнай камісіі дацэнт Р. А. Жмойдзяк.**

**● Звонкім голасам зачытвае дзяўчына тэмы сачынення.**

**● Якую выбраць! Тут трэба падумаць.**

# СТАРОНКА ПЕРШАКУРСНІКА

Гэтай раніцай ты, нарэшце, прыйшоў не ў знаёмы клас роднай школы ці на работу, якой аддаў першыя пасляшкольныя год-другі. Сёння чакала цябе незнаёмая і ад гэтага крыху таямнічая аўдыторыя і будучыя сябры, з якімі давядзецца дзяліць студэнцкія гады.

Зразумела, сёння ты поўны гонару. Твае веды, твая настойлівасць дапамаглі здзейсніць мару. Няхай па студэнцкай прымаўцы лічыцца, што першакурснік — яшчэ не студэнт,—у цябе ўсё наперадзе.

Пройдзе час, і ўсё стане прывычным: лекцыі, канспекты, сесіі, адзнакі ў залікоўцы.

Не ўсё будзе проста. Чакаюць і цяжкасці, і няўдачы, і сумненні: ці правільна выбран жыццёвы шлях. А потым прыйдзе ўпэўненасць: правільна!

Ты даведаешся з уласнага вопыту, што значыць ісці на экзамен з чужым канспектам, чым канчаюцца прагулы семінарскіх заняткаў якую ні з чым не параўнальную асалоду дае самастойны выдатны адказ на цяжкі білет.

З цягам часу па-сапраўднаму адчуеш адказнасць за веды, якія ты павінен атрымаць ва універсітэце, за ўменне выкарыстаць іх на практыцы і ў будучай рабоце.

Навучышся размяркоўваць свой час, каб усюды паспяваць, усё бачыць і ведаць, будзеш успрымаць усё найцікавейшае навокал. Гэта таксама элемент студэнцкага жыцця.

Толькі не вер, што гады вучобы праляцяць непрыкметна. Сапраўдны студэнт іх прыкмеціць, запомніць, задумаецца.

А ты, безумоўна, станеш сапраўдным студэнтам.

УСЕ мы калісьці былі першакурснікамі. Крыху наіўнымі, але задзёрыстымі і мэтанакіраванымі. Нам, учарашнім абітурыентам, хацелася бясконца хадзіць і хадзіць па прапахлых крэйдай і прасвечаных сонейкам аўдыторыях, чытаць старыя і вечныя, як свет, надпісы на партах «Sind+...».

Першы верасень. І праз дваццаць гадоў успомняцца і гэтая пара, і адчуванне сёмага неба, і пажаданне ад дэкана шчаслівай дарогі.

А ў Лены Дзямецкай, Івана Маеўскага, Ірыны Грынкінай, сёлетніх першакурснікаў, студэнцкае жыццё пачалося з мыцця вокнаў, падлогі, прыбірання ў цокалі галоўнага корпуса універсітэта, дзе размясцілася новая сталовая.

— Палітэканомія мне падабаецца.

— Але ж «падабаецца — не падабаецца» — гэтага мала. Сёння можа вабіць адно, заўтра — іншае. — Іван задумваецца.

— Не, не расчаруюся, — твар яго засвяціўся ўсмешкай. — У мяне ёсць вопыт. У арміі быў намеснікам камандзіра ўзвода, даводзілася праводзіць розныя заняткі з байцамі, у тым ліку палітвучобу. Не раз краналіся мы і пытанняў палітэканоміі.

— За якую справу возьмешся на факультэце?

— Зараз яшчэ цяжка сказаць. Хачу паспрабаваць сябе ў навуковай працы.

У гэты час з падаконніка саскочыла расчырванеўшаяся Ірына Грынкіна.

— Паступленнем на юры-

## БДУ СТАНОВІЦЦА СВАІМ

Ад усведамлення таго, што ты ўжо студэнт, студэнт буйнейшай навучальнай установы краіны, і праца ідзе шпарчэй. Хочацца вымыць гэтую падлогу так, каб зablішчэла, як люстэрка. Бо гэта ўжо «свая» сталовая, «свае» вокны.

— А яшчэ хочацца хутчэй сесці за парту, расказвае Лена Дзямецкая. — Цяпер у мяне мэта — вучыцца так, каб апраўдаць званне студэнта.

Лена закончыла СШ № 62 г. Мінска. Чаму выбрала ФПМ?

— Гэта ж так здорава: электронна-вылічальныя машыны! Будзе цяжка і складана... Нікуды не дзенешся ды і не прывыкаць.

— Як працуецца зараз?

— З радасцю

Такі ж настрой і ў першакурсніка - палітэканома Івана Маеўскага. Вучыўся ён у Ракаве, год працаваў, потым служба ў радах Савецкай Арміі. Цяпер новы віток стужкі ягонай біяграфіі, новая ступень, што вядзе да ведаў — універсітэт. Ці не выпадковасць яго выбар?

дычны факультэт я абавязана, канешне, сваім школьным настаўнікам.

— Юрыспрудэнцыя — гэта ж, відаць, сумная навука, — я дапытліва гляджу на дзяўчыну. Тая аж успыхнула:

— Як, сумная?! Патрэбная і цікавая!

— Ну, як жа: прыгодніцтвы, заблытаныя клубкі злачынстваў...

— Зусім не так. Ці ж я за таннай рамантыкай сюды прыйшла? Думаеце, уяўляю ўсё ў ружовым асвятленні? Не, я добра ведаю, што мяне чакае.

Аказваецца, дзед і бацька Іры — юрысты.

— Цяпер я прыняла эстафету. Нельга дакладна сказаць кім буду. Мабыць, пайду працаваць у дзіцячы пакой або юрысконсультам, — закончыла яна размову.

Развітваючыся з рабятамі, якія старанна вымяталі з пакояў смецце, я спытала рабочую - ізаліроўшчыцу А. С. Драйчукову, як працуюць памочнікі.

— Студэнты добрыя, працуюць выдатна.

**С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**

## БЫЦЬ ЦІ НЕ БЫЦЬ...

Як становяцца выдатнікамі?

Гэтае пытанне хвалюе не адно пакаленне першакурснікаў. Яны ведаюць — асаблівага, таямнічага рэцэпта няма, і ўсё ж такі, як?

Студэнтка факультэта журналістыкі Таня Скібіцкая вучыцца на трэцім курсе. Трэці год выдатніца. Тэрмін немалы і, па ўсяму бачна, што на дошку выдатнікаў яе фотаздымак трапіў невыпадкова.

Што дапамагло гэтаму?

Выключная працаздольнасць, працавітасць. Дзіву даешся, на ўсё — вучобу, бібліятэку, кіно і тэатр — хапае часу. Стаміўшыся за дзень, мы нярэдка скардзімся на галаўны боль і іншыя хваробы. А яна — заўсёды свежая, рухавая — нібы не было лекцый, напружанай падрыхтоўкі да практычных заняткаў. Ды яшчэ смяецца: — «Сябруйце са спортам! Ён дапамажа». А ў самой — сярэбраны значок ГПА.

Уменне спланаваць час. Не, у яе няма распісанага па хвілінах распарадку дня. Але ёсць іншае — беспамылковае адчуванне ступені важнасці таго або іншага працэсу, прадмета, справы; здольнасць вылучыць на першы план галоўнае, не закапацца ў другарадным, не страціць дарэмна ні хвіліны.

Уменне чытаць. Так-так, іменна чытаць. Яшчэ ў школе яна выпрацавала асобую сістэму: позірк не прабягае ўвесь радок, а спыняецца на сярэдзіне. Калі мы трацім на чытанне адной старонкі падручніка адну-дзве хвіліны, то яна — амаль напалавіну менш. У час сесіі гэтая якасць адыгрывае вялікую ролю. Таццяна першы раз прачытвае падручнікі і дапаможнікі хутка, каб вызначыць для сябе самае галоўнае. Потым чытае яшчэ раз, больш уважліва, а напярэдадні экзамена праглядвае цяжкія раздзелы. Паўсядзённа працуючы з падручнікам, Таня робіць запісы ў блакнот. Спакойна спіцца ёй у ноч перад экзаменам, якую некаторыя з нас праседжваюць над канспектамі. Ранкам перагорне старонкі блакнота і ідзе на факультэт, каб паспець самай-самай першай.

Актыўнасць на практычных занятках. Ды і не толькі на практычных. Яе голас заўсёды чуваць на камсамольскіх сходах, вечарах. Выдатнік — не той чалавек, што «закапаўся» ў адну навуку, а да астатняга — яго «хата з краю».

Упартасць. Яе прынцыпы: калі вучыцца, дык па-сапраўднаму. Дабірацца да сутнасці, да каранёў прадмета, навучыцца самой самастойна мысліць, аб усім мець асабістае меркаванне.

Усе неабходныя якасці выдатніка пералічыць нельга. Ясна адно, калі іх няма, трэба выхаваць гэтыя рысы ў сябе, трэба спалучыць здольнасці з воляй і настойлівасцю.

Быць ці не быць — гэта залежыць толькі ад цябе самога. Хочаш стаць выдатнікам — дык стань ім!

**С. УСЦІНОВІЧ.**

## МЭТА ПЛЮС ВОЛЯ

1968 год. Мне ўжо 28. Склалася сям'я, за плячыма тры спецыяльнасці і працоўны стаж 12 гадоў. Але чаму няма спакою? Мозг пастаянна пранізвае думка: трэба глядзець уперад, трэба крочыць у нагу з часам, трэба вучыцца.

Выбар аддзялення правазнаўства пры паступленні ў БДУ не быў выпадковым. Юрыст уяўляўся мне чалавекам, які ідзе насустрач людзям, спецыялістам, чыя прафесія вельмі неабходная для краіны.

Скажу прама, нялёгка давалася вучоба, асабліва на першым і другім курсах. Праца на вытворчасці, дзіцё, не вельмі добрыя бытавыя ўмовы — усё гэта ўскладняла вучобу. Не скрыю, спачатку з'яўляліся нядобрыя думкі: можа кінуць усё гэта, працаваць вадзіцелем, як працаваў, жыць спакойна і не марочыць галаву? Але іншая, больш упартая думка падказвала: ты ж марыў аб ВНУ, рыхтаваўся, паступіў. На цябе глядзяць з павагай таварышы... Прыгадалася мудрае выслоўе М. І. Калініна: «Цяжка—не значыць непераадольна».

У пастаянных клопатах і настойлівай працы праляцелі шэсць гадоў, поўныя радасцей і засмучэнняў. У памяці — аблічча выкладчыкаў, якія былі добрыя і строгія, але заўсёды справядлівыя. У памяці — сябры-аднакурснікі, з якімі шкада было расставацца.

Атрымаўшы дыплом аб вышэйшай адукацыі, мы ўсведамлялі, што на нас цяпер ляжыць вялікая адказнасць быць не толькі самому высокасвядомым, культурным чалавекам, але і выхоўваць гэтыя якасці ў падрастаючага пакалення.

Мы вельмі ўдзячны нашым выкладчыкам і заўсёды будзем помніць аб іх.

А пачынаючым, першакурснікам, хочацца пажадаць мэтанакіраванай, змястоўнай вучобы, высокіх, светлых задум і здзяйсненняў. Выпрацоўвайце ў сябе сілу волі, настойлівасць у дасягненні мэты, пераадольвайце ўсе цяжкасці на сваім шляху. У добры час!

**П. ВЕРАМЕЙ,**
**выпускнік аддзялення правазнаўства завочнага факультэта, супрацоўнік МУС.**



## ЯК ГЭТА БЫЛО

**(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).**

годзе, нарэшце, настойлівасць перамагла. Патрэбны бал ёсць, і яны — студэнты.

Сёння мы сардэчна віншуем усіх першакурснікаў са ўступленнем у студэнцкую сям'ю, жадаем шчаслівага пачатку вучобы!

**НА ЗДЫМКАХ:**

**● Экзамен па геаграфіі. А пытанне! — «Што збудоўваецца на Енісеі!»**

**● Наколькі трывалыя веды па гісторыі! Гэта цікавіць не толькі экзаменатараў, але і дэкана, і рэктара.**
**Фотарэпартаж Д. ПРЭСА.**

## ВАШ ЛЕПШЫ ПАМОЧНІК

Бібліятэка БДУ — адна з буйнейшых бібліятэк ВНУ рэспублікі. Узнікла яна разам з універсітэтам, у 1921 годзе, і першапачатковы кніжны фонд яе складаў 40 тысяч тамоў. А сёння бібліятэка мае найбагацейшы універсальны фонд, які налічвае 1150319 тамоў, штогод у бібліятэку паступае 50—60 тысяч кніг, часопісаў, вучоных запісак, бюлетэняў, прац, паведамленняў і іншых выданняў на розных мовах. Абслугоўвае бібліятэка звыш 20 тысяч чытачоў, выдае штогод больш 800 тысяч кніг.

У бібліятэцы функцыянiруюць наступныя аддзелы: камплектавання і апрацоўкі літаратуры, кнігазахавання, даведачна-бібліяграфічны, абанемент вучэбнай і навуковай літаратуры, чытальныя залы № 3 (гуманітарных і грамадскіх навук), № 4 (прыродазнаўчых навук), чытальная зала для прафесарска-выкладчыцкага саставу.

Абслугоўванне нашага шматаблічнага чытача ажыццяўляецца праз два дамашнія абанементы, чытальныя залы, кафедральныя бібліятэкі, якія складаюць адзіны аддзел абслугоўвання.

**Л. МІЦКЕВІЧ.**

## БЕРАЖЫЦЕ ЗДАРОЎЕ І ЧАС

Вучоба ва універсітэце патрабуе ад вас вялікага напружання сіл. Перш за ўсё давядзецца змяніць свой стары прывычны ўклад жыцця. На гэта пойдзе нямала нервовай энергіі і часу. Для таго, каб гэтая перабудова не адбілася адмоўна на стане здароўя, неабходна правільна скласці рэжым дня, рацыянальна размеркаваць свой час. У гэтым залог прадукцыйнасці вучобы першакурсніка.

Неабходна чаргаваць вучобу з адпачынкам, з фізічнай працай, з заняткамі фізкультурай і спортам. Дастаковым павінен быць сон уначы — не менш 8 гадзін. Не менш дзвюх гадзін трэба праводзіць на свежым паветры.

Неабходна правільна арганізаваць свой культурны адпачынак: наведваць кіно, тэатры, музеі, вечары.

Прыкладны рэжым дня:

7.00 — пад'ём, праветрыванне пакоя.

7.15 — гігіенічная гімнастыка, ранішні туалет.

7.45—8.10 — снеданне.

8.30—14.00 — заняткі ва універсітэце.

14.00—15.00 — абед.

15.00 — 16.00 — дзённы адпачынак (прагулка).

16.00 — 19.00 — самастойныя дамашнія заняткі.

19.00 — 19.30 — вячэра.

19.30 — 23.00 — дамашнія заняткі, прагулка перад сном.

Строга трэба падтрымліваць рэжым харчавання, прымаць ежу ў вызначаны час і ў патрэбным асартыменце. Абавязкова паснедаць дома, пасля заняткаў павінен быць гарачы абед і вечарам — вячэра.

Неабходна падтрымліваць асабістую гігіену, сачыць за чысцінёй скуры, валос. Вельмі важна падтрымліваць чысціню ў жылым памяшканні. У інтэрнаце нельга курыць у пакоі, нельга загружваць шафы і антрэсолі непатрэбнымі рэчамі.

Своечасова трэба звяртацца да урача на агляд, на прафілактычныя прывіўкі, для лячэння.

Жадаем вам добрага здароўя, выдатнай вучобы!

*Ф. РЭЗНІКАВА,*
*урач.*



**Да спаткання, працоўнае лета! Наперадзе два семестры напружанай вучобы, новых адкрыццяў, здабытых ведаў. Агрубелыя за лета рукі зноў возьмуцца за канспекты і падручнікі. Рамантыка атрадных спраў і рамантыка вучобы — родныя сёстры, раўнапраўныя часткі студэнцкага жыцця. У гэтым годзе адна з іх ужо адыйшла, аставіўшы ўспаміны і ўпэўненасць у сваіх сілах, другая — толькі пачынаецца. Падвядзенне вынікаў працоўнага семестра яшчэ наперадзе. А пакуль давайце ўспомнім атрадныя будні...**

**І. ФАНЯКОЎ.**

*Як вабіць вока, радуе мяне*
*Знаёмая і звычная карціна:*
*Цёмна-зялёных куртак бе' струмень,*
*Эмблемы «Квант», «Рамантык»,*
*«Брыганціна».*

*Ужо работа—і яшчэ гульня,*
*Ды доўга будуць сніць яны аб леце—*
*Новабудоўлі, песні ля кастра,*
*І—па заслугах—нарысы ў газеце...*

# МАЛАЙЦЫ!

Вось і скончыўся трэці працоўны семестр 1974 года. Сотні студэнтаў нашага універсітэта прынялі ўдзел у ім. Каля 250 з іх працавалі ў складзе Мінскага гарадскога студэнцкага будаўнічага атрада. І трэба сказаць, добра папрацавалі!

Студэнтаў БДУ можна было сустрэць на будаўнічых пляцоўках школ, інтэрнатаў, корпуса фізікі ў Шчамыслічы і нават на ўчастках камбіната дэкаратыўнага садоўніцтва, дзе працаваў СБА «Рамантыкі». Аб ім хочацца расказаць крыху падрабязней. Атрад быў створан на базе першага курса матэматычнага факультэта. Камандзір Зінаіда Соусь, камісар Марына Ціткевіч, нягледзячы на тое, што ўпершыню прымалі ўдзел у працоўным семестры, работу ў сваім атрадзе здолелі арганізаваць выдатна.

Дзяўчаты, а іх было 26 з 27 членаў атрада, паказалі сябе выдатнымі спартсменкамі. На спартакіядзе гарадскіх СБА валейбольная каманда «Рамантыкаў» заняла першае месца сярод жаночых каманд. У праграме многаборства комплексу ГПА дзяўчаты заваявалі другое месца, уступіўшы першынство толькі камандзе атрада «Спектр» радыётэхнічнага інстытута.

Атрад актыўна працаваў на суботніках і заробленыя грошы (160 рублёў) пералічыў у фонд салідарнасці «Савецкая моладзь — патрыётам Чылі» і ў фонд будаўніцтва горада Гагарына.

Выдатна была пастаўлена работа і ў студэнцкім будаўнічым атрадзе імя Ленінскага камсамола, які быў сфарміраван на базе гістарычнага факультэта (камандзір Уладзімір Карагін, камісар Вячаслаў Дашкевіч). Дастаткова сказаць, што гэты атрад пералічыў у фонд дапамогі чылійскім патрыётам і ў фонд будаўніцтва горада Гагарына 285 рублёў.

Добра папрацавалі дзяўчаты з атрадаў «Сонечны» (камандзір Святлана Лашч, камісар Людміла Даніловіч) і імя Ю. А. Гагарына (камандзір Валянціна Аляксеенкава, камісар Рэната Крыжаноўская).

Канешне, не абышлося без недахопаў і пралікаў, але пра іх размова яшчэ будзе.

**У. БАГУШЭВІЧ, інструктар палітаддзела Мінскага гарадскога штаба СБА.**

# РАДОК—ЗА ГАРЫЗОНТ

**Сваю працоўную біяграфію атрад філфака «Верасок» пачаў на гарадскіх аб'ектах. І пачаў упэўнена. Але вабіў студэнтаў іншы «клімат»—меліярацыя, геаметрыя блакітных каналаў. І вось пасля Паркавай магістралі месцам дыслакацыі «Вераска» стаў Чэрвеньскі раён, а сёлета атрад працаваў каля Смалявіч.**

Вёска Ліпкі. Працягам вуліцы, якая даходзіць да лесу, служаць зялёныя вагончыкі на ўзлеску.

На адным з іх чытаем: «Праспект Воўка» і не адразу рызыкуем рушыць далей. Вуліца Лясная ўсыпана шышкамі, і стаяць на ёй вазы з рамонкамі, зробленыя з дрэнажных трубак!

Наладжаны быт, парадак і чысціня навокал, вынаходлівасць, уменне рабіць з душой усё: ад плеценай агарожы каля кухні да дрэнажных ваз, прынесеных з балота, — красамоўна сведчаць аб адносінах да любой справы ў атрадзе.

Тут кожны ведае, што такое абавязак і ўнутраная патрэба: абавязак — у першы ж дзень знайсці магілу загінуўшых воінаў, абавязак — дапамагчы старому чалавеку, патрэба — навучыць добраму і карыснаму вясковых рабят.

Здаецца, што можа быць бестурботней, чым прагулка па вёсцы ў вольны час? Але ж...

Іван Міхалёў і Іван Надольскі зараз жа даведваюцца, што вось тут жыве адзінокі стары, а там — жанчына, якой патрэбна дапамога ў гаспадарцы.

— Бачым — бабуля сячэ хворaст, — расказваюць рабяты. Адрэкамендаваліся: вось, маўляў, студэнты мы, зайшлі дапамагчы...

Пасеклі мы ўвесь хворост. Паклікала нас бабка Алена ў хату, малаком напаіла, дзякавала ад усёй душы.

Вось так паклаў «Верасок» пачатак добрым справам. Не прайшоў і тыдзень, як пасяліліся ў вёсцы студэнты, а ўжо праявілі сябе: камусьці скошанае сена завезлі пад пакрыўку, камусьці бульбу дапамаглі акучыць, плот адрамантавалі, нарыхтавалі дровы. На магіле загінуўшых абнавілі агарожа. З'явіліся рамонкі пад драўлянай зоркай. Яны — ад студэнтаў.

І ёсць пры ўсім гэтым адна маленькая педагагічная хітрасць — прыцягваць да кожнай справы вясковых рабят.

Павінен адбыцца канцэрт у сельскім клубе — тутэйшыя хлапчукі і аб'явы павесяць, і патрэбнага чалавека знойдуць, а галоўнае— неабходнымі людзьмі сябе адчуюць.

Акрамя канцэртаў, лекцый, вечароў каля кастра, ёсць у атрада доўгі канал, дзе з ранку да вечара — работа, дзе стамляюцца рукі і спіны, дзе бывае гэтым летам то горача, то халадна.



...Ён высока ўздымаў над сабой кувалду і пружыніста апускаў яе. Працаваў так, як працуюць людзі, для якіх кожная хвіліна стваральнай працы — радасць. Я пазнаў Мікалая Цялегу. На адным з вечароў ва універсітэце ён, паэт з філфака, чытаў свае вершы. Кожны радок з іх вызначаў аўтара — валявога, улюбёнага ў жыццё. І вось ён тут, працуе ў брыгадзе калабоеў. Разам з усімі заканчвае дзевяты кіламетр канала. Тут таксама ён піша свой радок — за гарызонт. А той радок, які прыйдзе да Мікалая ў гучанні паэтычнага слова — будзе правераны яго сённяшняй працай.

«Верасок» працуе. Яго байцы маюць права сказаць аб сабе, што, акрамя прыхільнасці да літаратуры, ёсць у іх цяга і да штодзённых, звычайных спраў. Гэтыя справы ім па сіле.

*В. ДРАНЧУК.*







**1. Лагер «Вераска» — утульныя вагончыкі ў абдымках лесу за вёскай.**

**2. Перакур.**

**3. Працуюць каламы... Так-так, гэта не памылка. У атрадзе калабоі сапраўды перакваліфікаваліся. Віной гэтаму — эксперыментальная машына па замыванню калоў у грунт. Яна палегчыла працу рабят і павялічыла яе прадукцыйнасць. Іменна дзякуючы новай меліярацыйнай тэхніцы атрад змог датэрмінова выканаць большую частку дагаворных работ.**

**Дык вось, працуюць каламы Уладзімір Галеба і Мікалай Тарасевіч.**

**4. Партрэт ветэрана атрада, нязменнага камандзіра Асі Надольскай.**

**Фотарэпартаж В. ЖУКА.**

# ШЧОДРАСЦЬ

У гарадскім пасёлку Крупкі на аўтабазе № 16 хутка прывыклі да студэнтаў, якія будавалі там новы гараж.

Байцам атрада цяпер не вельмі верыцца, што гэтыя роўныя сцены склалі яны самі.

...Гараж — адзін з трох аб'ектаў атрада. Тут працуе другая, самая вялікая брыгада Вячаслава Лук'янца. Першая — Аляксандра Макарава і трэцяя — Юрыя Крышталёва будуюць жылыя дамы.

Вось ужо разгружана «Калхіда», што прывезла цэглу, і маладыя будаўнікі разыходзяцца па сваіх масцах.

Плаўна падымаюцца нагружаныя насілкі. Іх чакаюць Ха Хыу Гуі і Нгуен Тхань Фьёнг, студэнты з ДРВ.

Узяла ў рукі кельму і цагліну Іра Раманько. На яе майстэрства зайздросна глядзяць нават многія хлопцы. А побач кладзе вугал Тхай Ван Лан. Хто працаваў на будоўлі, ведае, што менавіта вугал — самае складанае ў муроўцы. Але ж Лан — адзін з лепшых муляраў атрада.

Работа для байцоў — не толькі выкананне дагавору, не толькі варыянт правядзення лета. Работа тут — творчасць. Працуюць рабяты з захапленнем. І кожны — незаменны.

— Вось, напрыклад, Грыша Бодзікаў, — расказвае майстар Юрый Ларчанка, — ён у нас спецыяліст па цяслярных работах і музыкант. Акрамя таго, усюды, дзе трэба добра памысліць, нам без яго не абысціся. Мастак ён прыдумваць усялякія прыстасаванні, якія аблягчаюць і паскараюць работу.

Брыгадзіра другой брыгады Славу Лук'янца характарызуюць адразу некалькі чалавек.

С. Сінкевіч, член брыгады: «Умее брыгадзір арганізаваць і размеркаваць работу. Патрабавальны. Але ніколі не накрычыць. Паважаюць яго».

М. Казлоўскі, камісар: «Адначасова Слава — рэдактар нашай насценнай газеты і выдатны баяніст».

В. Асмалоўская, урач: «Акрамя таго, ён танцуе лепш за ўсіх. Вось!»

Адрозніваецца гэты атрад асаблівай добразычлівасцю і добрасардэчнасцю. У «Чырвонай змены» багата сяброў. З некаторымі яна звязана асабліва моцна. Найбольш тактоўна ахоўваюць байцы сваю дружбу з атрадам «Ікар».

Існуе «Ікар» першы год, усе байцы ўпершыню ў СБА, камандзір і камісар — таксама. Вельмі не хапала атраду ў першыя дні працоўных навыкаў. Не ладзілася работа. Даведаліся аб гэтым у «Чырвонай змене» і вырашылі: нельга астаўляць таварышаў у бядзе, там свае ж рабяты — фізікі. Камандзір Міша Волкаў і майстар атрада Юрый Ларчанка паехалі ў «Ікар».

— Нам трэба было высвятліць: ці сапраўды ў «Ікара» з работай штосьці не атрымліваецца, ці проста яго байцы спужаліся цяжкасцей. Прыехалі, пагаварылі з рабятамі, паглядзелі. Бачым, сапраўды вопыту не хапае. Сумесна вырашылі на адзін тыдзень абмяняцца двума байцамі і такім чынам дапамагчы суседзям весці будаўнічыя работы і абучыць іх муляраў.

Доўга спрачаліся аб тым, каму ехаць у адстаючы атрад. Пасылаць трэба было лепшых, каб не страцілі гонар атрада і змаглі многаму навучыць «ікараўцаў».

Паехалі сапраўды лепшыя — сябры Леанід Страцкевіч і Тхай Ван Лан. І вучылі яны новых сяброў усім прамудрасцям атраднага жыцця.

— Ім было цяжка самім, — успамінае Лан, — рабяты вельмі дзякавалі за дапамогу. Мы ўсе моцна пасябравалі.

Двое байцоў з «Ікара» ў гэты час жылі і працавалі ў «Чырвонай змене». І вучылі іх таксама найбольш вопытныя муляры: Іра Раманько і Алег Сычоў.

«Чырвоная змена» — атрад моцны, цікавы. Ён выдатна працуе, вядзе вялікую грамадскую работу. Але ведаюць усе: поспех атрада памяншаецца няўдачай суседняга. І калі ты маеш магчымасць дапамагчы — ты не пройдзеш міма. Так лічаць байцы.

«Ніводнага адстаючага побач!» — гэты дэвіз лепшых студэнцкіх груп становіцца сёння дэвізам студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

**Т. АБРАМОВІЧ.**

# ВЕРАСНЁЎСКІ КАЛЯНДАР

1 **верасня—УСЕСАЮЗНЫ ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ НАФТАВАЙ І ГАЗАВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ.**

1 **верасня**—100 гадоў з дня нараджэння В. Р. Мянжынскага (1874—1934), савецкага дзяржаўнага і партыйнага дзеяча.

2 **верасня 1945 г.** Абвяшчэнне Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам.

2 **верасня 1945 г.**—Падпісан акт аб безагаворачнай капітуляцыі Японіі.

2 **верасня**—25 гадоў з дня адкрыцця (1949) ў Будапешце II кангрэса Сусветнай федэрацыі дэмакратычнай моладзі.

4 **верасня**—100 гадоў з дня нараджэння А. В Вішнеўскага (1874—1948), савецкага хірурга.

8 **верасня—ДЗЕНЬ ТАНКІСТАЎ.**

8 **верасня—МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ САЛІДАРНАСЦІ ЖУРНАЛІСТАЎ.**

8 **верасня**—50 гадоў з дня нараджэння Л. Г. Шаўцовай (1924—1943), члена штаба падпольнай камсамольскай арганізацыі «Маладая гвардыя», Героя Савецкага Саюза.

9 **верасня 1948 г.**—Абвяшчэнне Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі.

9 **верасня**—30 гадоў сацыялістычнай рэвалюцыі ў Балгарыі (1944). Нацыянальнае свята балгарскага народа—Дзень свабоды.

11 **верасня**—80 гадоў з дня нараджэння А. П. Даўжэнкі (1894—1956), савецкага кінарэжысёра і кінадраматурга.

15 **верасня—ДЗЕНЬ РАБОТНІКА ЛЕСУ.**

16 **верасня** —10 гадоў з дня адкрыцця (1964) ў Маскве Сусветнага форума моладзі.

19 **верасня**—15 гадоў з дня апублікавання (1959) Дэкларацыі Савецкага ўрада аб усеагульным і поўным разбраенні.

20 **верасня**—100 гадоў з дня нараджэння М. А. Сямашкі (1874—1949), савецкага дзяржаўнага і партыйнага дзеяча, аднаго з арганізатараў савецкай аховы здароўя.

24 **верасня 1970 г.**—Упершыню ў гісторыі асваення касмічнай прасторы месячны грунт быў дастаўлены на Зямлю з дапамогай вяртаемага апарата савецкай аўтаматычнай станцыі «Месяц-16».

26 **верасня**—125 гадоў з дня нараджэння І. П. Паўлава (1849—1936), савецкага фізіёлага.

29 **верасня**—70 гадоў з дня нараджэння М. А. Астроўскага (1904—1936), савецкага пісьменніка.

29 **верасня—ДЗЕНЬ МАШЫНАБУДАЎНІКА.**

# Р. А. ЛЕВІН

28 жніўня 1974 года раптоўна памёр відны савецкі філосаф, спецыяліст у галіне дыялектычнага матэрыялізму, старэйшы выкладчык БДУ і прапагандыст марксісцка-ленінскай філасофіі, камуніст Рыгор Аронавіч Левін.

Р. А. Левін нарадзіўся 7 студзеня 1907 года ў вёсцы Азарычы Даманавіцкага раёна Гомельскай вобласці. У 1929 годзе закончыў факультэт права і гаспадаркі БДУ, а затым, у 1932 годзе аспірантуру АН БССР. У 1951 годзе ён абараніў кандыдацкую дысертацыю па філасофіі. Уся далейшая дзейнасць Р. А. Левіна была прысвечана выкладанню марксісцка-ленінскай філасофіі і навуковым даследаванням у гэтай галіне. На працягу чатырох гадоў Р. А. Левін загадваў кафедрай марксісцка-ленінскай філасофіі Мінскага юрыдычнага інстытута, а затым, пачынаючы з 1954 года і да апошніх дзён, працаваў дацэнтам і прафесарам кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі БДУ.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Р. А. Левін быў у радах Савецкай Арміі.

У 1968 годзе Р. А. Левін паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю па важнай і актуальнай тэме «У. І. Ленін і сучасныя праблемы тэорыі пазнання». У 1969 годзе яму было прысвоена вучонае званне прафесара.

Больш за 30 гадоў навукова-даследчай дзейнасці Р. А. Левіным было напісана 35 работ. Самай значнай яго працай з'яўляецца манаграфія «У. І. Ленін і сучасныя праблемы тэорыі пазнання». Ён актыўна працаваў у галіне падрыхтоўкі высокакваліфікаваных філасофскіх кадраў Беларусі. Р. А. Левін чытаў лекцыі па адказных курсах філасофіі, методыцы выкладання філасофіі на філасофскім аддзяленні БДУ. Паспяхова рыхтаваў ён аспірантаў, быў кансультантам раду вучоных, якія рыхтавалі доктарскія дысертацыі.

Значную работу правёў Р. А. Левін у інстытуце павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук пры БДУ. Ён шчодра дзяліўся сваімі багатымі навуковымі ведамі і вялікім метадычным вопытам з выкладчыкамі філасофіі ВНУ, праходзячымі перападрыхтоўку ў гэтым інстытуце.

На працягу больш 20 гадоў Р. А. Левін з'яўляўся вядучым выкладчыкам марксісцка-ленінскай філасофіі вячэрняга універсітэта марксізму-ленінізму пры Мінскім гаркоме КПБ. Ён вёў вялікую работу па прапагандзе марксісцка-ленінскай філасофіі сярод працоўных Мінска.

Якая б работа ні была даручана Р. А. Левіну, яна выконвалася ім на высокім узроўні, з душой, як гэта і належыць камуністу.

Балюча ўсведамляць, што заўчасная смерць абарвала плённую педагагічную і навукова-даследчую работу прафесара Р. А. Левіна, яго вялікія навуковыя планы і задумы.

Светлая памяць аб Рыгору Аронавічу Левіну, адданым камунісце, чулым чалавеку, нястомным выхаваўцы моладзі назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

**Група таварышаў.**

# Нам лета гаворыць: бывай...



Блакітнае возера, невялікія драўляныя домікі, палаткі, што размясціліся ў сасновым бары — гэта нарачанскі спартыўна - аздараўленчы лагер.

На жаль, у гэтым годзе ўжо вельмі часта сонейка гуляла з намі ў хованкі. Але амаль усім удалося ўсё-такі змяніць колер скуры. А вось з-за дрэннай «работы нябеснай канцылярыі» правесці свята Нептуна мы не змаглі. Марскі цар аказаўся незгаворлівым: ніякія просьбы не дапамаглі выцягнуць яго з глыбінь падводнага царства пад нястомны дожджык.

Паколькі лагер наш спартыўна -аздараўленчы, фізкультура і спорт займалі вялікае месца. Раніцай на лінейцы раздаваўся голас намесніка начальніка лагера па спартыўна-масавай рабоце М. А. Шэйнемана: «На зарадку бягом марш!». Ён жа быў арганізатарам спаборніцтваў паміж атрадамі па валейболу, настольнаму тэнісу, шахматах. Найбольш запомніліся таварыскія сустрэчы па валейболу паміж камандамі універсітэта і інстытута замежных моў, чый лагер размясціўся паблізу, зборнымі студэнтаў і супрацоўнікаў лагера.

Цікава быў арганізаван і культурны адпачынак. Дарадчыкамі і ініцыятарамі тут выступалі бібліятэкар Луіза Іосіфаўна Зрубовіч, члены лагернага савета Ларыса Сініца і Святлана Зверава. Пры самым актыўным іх удзеле прайшоў вечар паэзіі, прысвечаны Пабла Нярудзе.

Атрадныя вечары... Вось дзе была магчымасць разгарнуцца талентам! Трэба ж было займальна арганізаваць вольны час усяго лагера, скласці канцэртную праграму, правесці захапляючыя атракцыёны. Адны атрады рыхтавалі вечары як дэманстрацыю лагернага жыцця ў мініяцюры, іншыя стваралі цэлыя спектаклі. З захапленнем глядзелі мы танец «маленькіх лебедзяў» у выкананні рабят-штангістаў з V атрада, слухалі «хор хлопчыкаў» з II атрада, уразіў «Іудушка» С. Зверавай і іншыя выступленні.

Бясспрэчна, вялікім памочнікам у правядзенні вечароў адпачынку быў вакальна - інструментальны ансамбль пад кіраўніцтвам студэнта фізічнага факультэта Ігара Пражогі.

Рабяты выязджалі з канцэртамі ў Мядзель, на мітынг, прысвечаны 30-годдзю вызвалення Мядзельскага раёна ад нямецка - фашысцкіх захопнікаў, пабывалі ў гасцях у лагеры інстытута народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава і, канешне, спявалі і гралі для нас.

Многа цікавага засталося ў памяці тых, хто правёў канікулы ў лагеры: і аднадзённыя турпаходы, і паходы на Блакітныя азёры, і паездка ў Вільнюс, прагулкі на цеплаходзе па Нарачы, і агляды-конкурсы атрадных насценных газет, і канцэрты... Мы добра адпачылі і нават загарэлі, набраліся сіл. Думаю, што і ў наступным годзе многія зноў паедуць у цудоўны нарачанскі край, ва універсітэцкі лагер.

**Л. ФАРНАКОВА,**
**студэнтка філфака.**

*ЯК НЕ ТРЭБА СЯБЕ ПАВОДЗІЦЬ*

# «СЛОВА—СЕРАБРО, МАЎЧАННЕ — ЗОЛАТА»

Аснова зносін паміж людзьмі — мова. Аб ёй, аб мове, а дакладней, аб тым, як размаўляць, і хочацца пагаварыць падрабязней. У большасці выпадкаў манера чалавека размаўляць дазваляе меркаваць аб ступені яго культуры і выхаванасці.

Канешне, не кожны можа ўразіць субяседніка глыбінёй і арыгінальнасцю сваіх меркаванняў, ды гэта і не абавязкова. Перш за ўсё належыць засвоіць тое, чаго катэгарычна (ніколі, ні ў якім выпадку) нельга рабіць.

Кожны ведае, напрыклад, што недапушчальна быць на людзях нябрытым, нельга грызці ногці, чысціць іх, громка смаркацца.

Але не кожны ведае, што на людзях нельга быць сумным, заклапочаным, злосным. Калі ў вас дрэнны настрой або якія-небудзь непрыемнасці, дык нашто вам гэта дэманстраваць?

Нельга ў час гутаркі грымаснічаць, крывіць рот, моршчыць лоб і нос — гэта не толькі абражае субяседніка, але і робіць вас смешным.

Не трэба вымаўляць звычайныя словы шматзначна. Гэта могуць зразумець як ваш намер быць арыгінальным.

Не трэба перабіваць або перарываць субяседніка. Пастаўце сябе на яго месца — вам гэта б спадабалася?

Увогуле такая мысленная падмена прыносіць вельмі вялікую карысць.

У адной камедыі гаворыцца: «Майстэрства гутаркі — гэта майстэрства маўчання». Парадокс расшыфроўваецца лёгка: слухаць уважліва таксама складана, як і расказваць займальна.

Таму спачатку слухайце, слухайце і слухайце.

Калі субяседнік разумны, востры, добра выхаваны, цікавы — вы можаце многаму ў яго навучыцца. Калі ж ён сам не валодае ні культурай гутаркі, ні веданнем жыцця — вы, слухаючы, хутчэй зразумееце памылкі, што робіць чалавек, які многа і без толку гаворыць.

**М. ХАДАКОЎ.**

# ДАПАМОЖАМ, АДКАЖАМ, ЗНОЙДЗЕМ

Многія з тых, хто сёння з гонарам называюць сябе першакурснікамі, і тыя, хто па той ці іншай прычыне так і не змаглі развітацца са званнем абітурыента, на працягу ліпеня і жніўня не аднойчы ўваходзілі ў дзверы, надпіс на якіх паведамляў: «Грамадская прыёмная камісія» (ГПК). За гэтымі дзвярыма працавалі мы, яе члены.

Існуе ГПК ва універсітэце чацвёрты год і дзейнічае яна не толькі ў летнія месяцы. На працягу года мы рассылалі матэрыялы аб БДУ жадаючым паступіць вучыцца ва універсітэт, праводзілі дні адчыненых дзвярэй, часта выступалі з лекцыямі перад дзесяцікласнікамі, арганізоўвалі для іх сустрэчы з вядомымі вучонымі, якія закончылі БДУ.

Але больш за ўсё работы было, зразумела, у перыяд прыёму і афармлення дакументаў — у ліпені.

Наша ж змена пачала працаваць ужо ў жніўні. Першым выпрабаваннем было рассяленне абітурыентаў па інтэрнатах. Тады да нас прыходзіла амаль па 300 чалавек у дзень. ГПК узяла своеасаблівае шэфства над інтэрнатамі. Мы часта заходзілі да абітурыентаў, знаёмілі іх з устаноўленымі ў інтэрнаце правіламі. Толькі ў нас можна было даведацца, дзе знайсці таго ці іншага з паступаючых, бо мы вялі алфавітныя кнігі паселеных у інтэрнат.

Але часцей за ўсё нам даводзілася адказваць на самыя розныя пытанні. Аб чым толькі не спрабавалі ў нас даведацца: які́м будзе конкурс на той ці іншы факультэт, які ў гэтым годзе прахадны бал, што будзе, калі на экзамене ў абітурыента знойдуць шпаргалку і г. д. Мы тлумачылі і адказвалі..

А потым усё часцей у прыёмную камісію сталі заходзіць бацькі абітурыентаў. Кожны клапаціўся аб лёсе свайго дзіцяці, спадзяваўся вызнаць раней тэрміну яго экзаменацыйную адзнаку.

Усім нашым дзяўчатам хапала работы, часта вельмі адказнай, якая патрабавала напружанай увагі і абавязковай дакладнасці. Аксана Макушчанка прызнаны плакатапісец. Яна адказвала за афармленне нашага памяшкання, выпуск насценных газет. Наташа Бауткіна, Наташа Мішына і іншыя заўсёды былі гатовы змястоўна растлумачыць кожнаму абітурыенту ўсё для яго незразумелае. Думаю, што тыя, каму давядзецца паступаць і ў наступным годзе, абавязкова будуць карыстацца дапамогай грамадскай прыёмнай камісіі.

І апошнім нашым фронтам работ у жніўні было працаўладкаванне абітурыентаў, не прайшоўшых па конкурсу. Мы накіроўвалі іх у будаўнічыя ўпраўленні Мінска, у вытворча-тэхнічнае аб'яднанне «Інтэграл», на камсамольскія будоўлі Беларусі.

Наша работа скончана, і мы задаволены ёй. Ведаем, што многім з тых, каму пашчаслівілася ў гэтым годзе стаць першакурснікамі БДУ, патрэбна была наша дапамога, і мы змаглі яе аказаць.

**Т. МІХАЛЁВА,**
**студэнтка III курса фізфака.**



# УВАГА, АМАТАРЫ МУЗЫКІ

**Лаўрэат Усесаюзнага і рэспубліканскага конкурсаў народны аркестр народных інструментаў аб'яўляе дадатковы набор.**

**Запрашаюцца дамрысты, балалаечнікі, цымбалісты, баяністы, акардэаністы, піяністы, салісты-вакалісты.**

**Запіс у аркестр сёння, 2 верасня, у 19.00., аўдыторыя № 603 галоўнага корпуса.**

**ПРАЎЛЕННЕ КЛУБА**

Рэдактар **А. А. НІКОЛЕНКА.**

«Белорусский университет» —орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ем — 1 друк. ар.
Газета выходзіць па чацвяргах.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Тыраж 2000 экз. АТ 05430 Зак. 1123.